

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 10 (227) 15 лістапада 1995 года, серада*

## Дысертацыі абаранілі ў Гродне

Абарона дысертацый на спашуканне вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук у Гродне - адметная падзея ў навуковым жыцці не толькі нашага універсітэта, а нават і рэгіёна.

Яшчэ 2 гады таму, расказваў у гутарцы з карэспандэнтам прафесар, доктар юрыдычных навук М.У.Сільчанка, нас, гродзенцаў, дакаралі на Пленуме вышэйшай атэстацыйнай камісіі за адсутнасць спецыялізаванага Савета па абароне дысертацый. У той час не было такіх Саветаў ні ў Гродне, ні ў Брэсце, ні ў Магілёве. І вось 16 мая, пасля вялікай падрыхтоўчай работы ў нашым універсітэце, вышэйшая атэстацыйная камісія пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняла рашэнне аб стварэнні ў ГрДУ Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый. У склад яго ўвайшло 11 чалавек.

Савет даручана ўзначаліць М.У.Сільчанку - загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права факультэта права і эканомікі. Зараз Савет кампетэнтны прымаць да абароны і разглядаць кандыдацкія дысертацыі па двух спецыяльнасцях: 12.00.01. "Тэорыя і гісторыя дзяржавы і права; гісторыя палітычных і прававых вучэнняў" і 12.00.09. "Крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза".

Першымі ў нашым універсітэце абаранялі кандыдацкія дысертацыі былыя выпускнікі і аспіранты ГрДУ В.І. Леванец і В.Б.Шабанаў. Абраныя імі тэмы "Крыміналістычная метадалогія пераадолення латэнтных памылак", "Асаблівасці расследавання злачынстваў у ВПУ", зазначыў у гутарцы з карэспандэнтам М.У. Сільчанка, даследаваны грунтоўна, значна падмацаваны навуковымі працамі спашукальнікаў.

Застаецца яшчэ раз павіншаваць маладых вучоных, якія толькі што абаранілі ў родных сценах кандыдацкія дысертацыі, і пажадаць: няхай іх колькасць у нас расце!

*С. Бераст.*



Студэнты і выкладчыкі універсітэта ў дзень сустрэчы з паслом.

Фота Ул.Сарокіна.

*БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!*

## На "свежае" вока

Кастрычнік... Час падсумоўваць сабраны ўраджай і брацца як след за навуку... На пачатку месяца прырода падаравала нам яшчэ з дзесятак сонечных цёплых дзён пяшчотнага "бабінага" лета, што патаналі ў золаце трапяткога лісця, і ўсе вуліцы, скіраваныя да універсітэта, набылі непаўторную прывабнасць. І вось праз шмат гадоў мне пашчасціла накіравацца па адной з іх: не няўдалай абітурыенткай, а ўжо сталым чалавекам уваходжу ва універсітэт. З гэтага часу пачынаецца новы перыяд маёй творчай працы. І каб не быць "белай варонай" ва універсітэцкім асяроддзі, стукаюся ў дзверы, знаёмлюся з людзьмі, іх праблемамі і здабыткамі. Радуюся: якія спагадлівыя, у большасці сваёй, добразычлівыя людзі тут. Цярплівa і тактоўна, бо сапраўдныя інтэлігенты, тлумачылі мне, новаму чалавеку, падрабязнасці надзённых спраў і клопатаў, шчыра адгукаліся на просьбу дапамагчы хутчэй спасцігнуць універсітэцкія будні, такія вірлівa-імклівыя, неаднастайныя.

Адразу і пашанцавала. Якраз завітаў у самую вялікую універсітэцкую залу, дзе сабралася студэнцкая моладзь і выкладчыкі, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол ЗША ў Рэспубліцы Беларусь сп. Яловіц. Відаць, не выпадкова праграма візіту ў Гродна прадугледжвала і наведванне нашага універсітэта. Трэба было чуць, якія разумныя, цікавыя, надзённыя пытанні адрасаваліся госцю. Шмат якія не патрабавалі нават дапамогі перакладчыцы, бо прагучалі на роднай мове госця. Прыемна ўражаны быў сп. Яловіц, калі нехта, відаць, з навукоўцаў, запытаў, ці не з нашых мясцін яго продкі, бо ў гістарычных звестках гэта прозвішча сустракаецца. Так, сапраўды, пацвердзіў госць з Амерыкі, менавіта недзе ў гэтым рэгіёне яго гнеаалагічныя карані, і ён хацеў бы абмеркаваць гэту акалічнасць з чалавекам з залы.

Не вельмі даўно ў спадчыну універсітэту з партыйнай маёмасці перададзены чатырохпавярховы гмах па вуліцы Леніна. Некалі тут адбываліся велічныя ўрачыстасці пры сцягах і аркестрах. Зараз у вялікіх і малых памяшканнях шчыруе моладзь, апранутая ў джынсы і прагная роднай мовы і культуры. Яны - наша надзея, наша будучыня, бо каму, як ні ім, што вывучаюць сёння беларускую мову і літаратуру, гісторыю і культуру, заўтра быць асветнікамі, шчыра шанаваць і распаўсюджваць набыткі Бацькаўшчыны. А яшчэ гэтым светлавокім прыгажуням трэба будзе працягваць род чалавечы. А яны што? Прызвычаіліся да цыгарэт (як і біёлагі, юрысты, фізікі) і ніяк ад іх не жадаюць адмовіцца. На перапынках паляць не менш за аднакурснікаў. Яшчэ не забыты выпадак, як ледзь не згарэў па неасцярожнасці аматарак цыгарэт былы Дом палітасветы. Нехта з дзяўчат закінуў запалку ў анучы прыбіральшчыцы, а дзверы ў тую камору аказаліся зачыненымі на вялікі замок. Чорны дым, расказвалі, ужо запаланіў першы паверх, пакуль удалося дабрацца да полымя і патушыць яго.

Яшчэ пра культуру, у бытавым яе сэнсе. Гардэробшчыцы, якія добра памятаюць паважных гаспадароў Дома палітасветы, не перастаюць абурацца паводзінамі маладых і дужых студэнтаў, якім не хочацца стаяць у чарзе за паліто. Працягнуўшы руку праз бар'ер, бяруць адзенне сваё і таварыша. А можа здарыцца, здымуць і чужую "скуранку" коштам за мільён. Вельмі пажадана, каб гаспадарнікі універсітэта прыслухаліся, нарэшце, да просьбаў гардэробшчыц і крыху вышэй паднялі бар'ер. Трэба таксама, каб у некага дайшлі рукі і да масіўных уваходных дзвярэй, якія не забяспечаны спружынамі, а таму ўвесь час адчыненыя. Зіма ж прыспешвае, неўзабаве загуляюць тут скразнякі са снегам.

Было б добра, каб студэнты і ў гэтым корпусе універсітэта, і ў іншых не пакідалі пасля сябе ў глыбіні сталоў цэлыя горы сланечнікавай лускі і яблыкавых абгрызкаў. Не да твару гэта будучым педагогам. Я бачыла, як немаладая ўжо прыбіральшчыца ледзь не плакала, выграбаючы смецце...

На жаль, сёння факультэту філалогіі цесна нават у гэтым шыкоўным будынку па вуліцы Леніна. Бывалі выпадкі, у вялікай канферэнцзале адначасова займаліся ажно тры групы. Тры выкладчыкі, імкнучыся не замінаць адзін другому, упаўголаса тлумачылі тэмы. Добра, што хоць, нарэшце, "Алгарытм" з'ехаў па іншым адрасе. Хутка памяшканні, арэндаваныя "кватарантам", будуць абсталяваны

*(Працяг на 3-й стар.)*



# НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

29 верасня адбылося пасяджэнне Вучонага Савета. Разглядаліся вучэбныя планы факультэтаў. Факультэт фізічнай культуры прапанаваў эксперыментальны план па спецыяльнасці "Фізкультура-біялогія", дарэчы, такой спецыяльнасці не дае ніводзін факультэт фізічнай культуры ў рэспубліцы. Вучоны Савет зацвердзіў гэты вучэбны план. Таксама зацверджаны вучэбныя планы матэматычнага факультэта па спецыяльнасці "Эканамічная кібернетыка" са спецыялізацыяй "Матэматык-эканаміст", факультэта псіхалогіі і педагогікі па новай спецыяльнасці "Юрыдычная псіхалогія" і некаторых іншых, якія будуць працаваць па індывідуальных планах, гуманітарнага факультэта па спецыялізацыі "Правазнаўства", планы факультэта замежных моваў, аддзяленняў МЭА і АДП. Факультэт філалогіі прапанаваў замест спецыялізацыі "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры і рыторыкі" спецыялізацыю "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры, сусветнай і айчыннай культуры", але члены Вучонага Савета палічылі гэты вучэбны план недапрацаваным і прапанавалі абмеркаваць яго на наступным пасяджэнні Вучонага Савета.

Па пытанню зацвярджэння кандыдацкіх праграмаў (па здачы экзаменаў кандыдацкага мінімуму) выступіў прарэктар па навуковай працы С.А.Маскевіч. Ён паведаміў, што з 28 спецыяльнасцяў, па якіх ідзе падрыхтоўка аспірантаў, па 14 мы можам прымаць экзамены. Ужо ёсць праграмы гэтых экзаменаў, у распрацоўцы якіх прынялі ўдзел многія факультэты, аддзяленні і кафедры. Вучоны Савет зацвердзіў прапанаваныя праграмы.

І.І Вялента выступіў па пытанню праекта Статута ГрДУ. Гэты праект распрацоўваецца на працягу апошніх гадоў. Статут рэгулюе тыя пытанні, якія не рэгулюе закон. Карацей кажучы, Статут павінен падпарадкоўвацца наступнаму прынцыпу: "Дазволена тое, што не забаронена законам". Прыняцце Статута, аднак,не дае гарантый, што нашы правы не могуць быць парушаны. Праект Статута мае яшчэ шмат спрэчных момантаў, таму Вучоны Савет прапанаваў прыняць за аснову гэты праект і рэкамендаваў надрукаваць яго ў газеце "Гродзенскі універсітэт" для абмеркавання і ўнясення дапаўненняў і паправак.

Савет абмеркаваў шэраг арганізацыйных пытанняў.

## З ПАСТАНОВЫ ВУЧОНАГА САВЕТА АД 29.09.95 г.

У мэтах паляпшэння фінансавай дысцыпліны і ўдасканалення арганізацыі аплаты за навучанне студэнтаў гуманітарнага факультэта, Вучоны Савет Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы пастанавіў:

пры аднаўленні студэнтаў, адлічаных за парушэнні правілаў унутранага распарадку універсітэта або ўмоваў дагавору, студэнты абавязаны ўнесці суму ў памеры 5 (пяці) тарыфных ставак 1 разраду, якія дзейнічаюць на дзень унясення аплаты.

## Савет — у новым складзе

Калі гэты нумар газеты быў ужо падрыхтаваны да друку, адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага Савета універсітэта ў новым складзе. На ім былі разгледжаны наступныя пытанні: выбранне па конкурсу; аб перспектывах развіцця навуковых даследаванняў факультэта замежных моваў на 1996-2000 гады; аб стане і мерах па паляпшэнню эфектыўнасці навучальнай і метадычнай працы на факультэтах гісторыі і культуры, філалогіі, псіхалогіі і педагогікі, права і эканомікі.

***АЛІМПІЯДА - 95***

# НАШЫ - НА ТРЭЦІМ МЕСЦЫ

У другой дэкадзе кастрычніка ў Белдзяржуніверсітэце прайшла рэспубліканская алімпіяда па інфарматыцы сярод універсітэтаў. Калі некалькі гадоў таму ў рэспубліцы было ўсяго тры універсітэты, зараз колькасць іх узрасла (інстытут народнай гаспадаркі пераўтварыўся ў эканамічны універсітэт, радыётэхнічны інстытут стаў універсітэтам радыё і электронікі), адпаведна ўзрасла колькасць і моцных каманд.

Апошні раз такая алімпіяда праводзілася пяць год таму. Зразумела, што ва ўсіх удзельнікаў алімпіяды было вялікае жаданне перамагчы. Аднак найвялікшае імкненне да перамогі праявілі гаспадары алімпіяды: факультэт дастасоўнай матэматыкі і інфарматыкі БДУ прадставіў на алімпіяду дзве каманды. Гамельчане, акрамя каманды з пяці чалавек, прывезлі яшчэ трох студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў індывідуальным заліку.

Гонар нашага універсітэта абаранялі студэнты Віктар Лісоўскі (4-ы курс), Аляксандр Судараў (3-і курс), Аляксандр Салаўёў (3-і курс), Станіслаў Сабалеўскі (2-і курс), Максім Якавенка (1-ы курс).

Напружаная барацьба працягвалася 2 дні. Асабліва цяжкім і адказным быў першы тур алімпіяды, у якім трэба было вырашыць задачу на мове асэмблера. Задачы, дарэчы, рыхтаваў навуковы камітэт алімпіяды, у склад якога ўвайшлі выкладчыкі Белдзярж-універсітэта. Заданні першага тура ў поўным аб'ёме адолелі толькі тры студэнты БДУ. Другі тур быў больш удалым для нашай каманды.

У выніку першае і другое месцы занялі каманды БДУ, а трэцяе каманда нашага універсітэта падзяліла з гамельчанамі, значна апярэдзіўшы каманду універсітэта радыё і электронікі.

Наступная рэспубліканская алімпіяда па інфарматыцы адбудзецца таксама ў Мінску будучай вясною. Нашы студэнты рашуча настроены ў наступны раз дамагчыся лепшых вынікаў. Відавочна, што для гэтага трэба больш дасканала падрыхтавацца, бо можа стацца, што БДУ прадставіць на алімпіяду... тры свае каманды.

*Н. Пераверзева,*
*кіраўнік каманды, дацэнт кафедры інфарматыкі і ВТ.*

## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

**БОЛДАК Іры[…] Аляксандраўну**, дацэ[…] кафедры замежных мов[…]

**ГАЙДАШАВУ Нэ[…] Віктараўну**, загадчы[…] лабараторыі гуманітарна[…] факультэта.

**ДЗЯНІШЧЫК Іры[…] Ігнацьеўну**, дзяжурну[…] інтэрната N 4.

**КАНДРАТОВІ[…] Яўгенію Ільінічн[…]**, метадыста навучальна[…] метадычнага аддзела.

**КІРЫЛАВУ Вольг[…] Міхайлаўну**, дацэнт[…] кафедры біялогіі.

**ДАНІЛОВІЧА Мікала[…] Аляксандравіча**, дацэнт[…] кафедры мовазнаўства.

**ЛУЧКО Валянціна[…] Станіслававіча**, дацэнта[…] кафедры біяхіміі […] біятэхналогіі.

**ДЗЮБУ Аляксея Ільіча**, рабочага універсітэта.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ - ЛЕПШЫМ

На падставе рашэння Савета універсітэта з 1 кастрычніка гэтага года ўстаноўлены імянныя стыпендыі наступным студэнтам:

**імя Леніна:**

***СІНКЕВІЧУ Раману Раманавічу*** - 5 курс 4 група матэматычнага факультэта;

***БЯСКОСТАМУ Вячаславу Васільевічу*** - 4 курс 5 група факультэта права і эканомікі МЭА;

***ПАВАЧКА Сяргею Рыгоравічу*** - 3 курс 1 група факультэта філалогіі.

**імя Янкі Купалы:**

***МАЛІНОЎСКАЙ Наталлі Аляксандраўне*** - 5 курс 1 група факультэта філалогіі.

**Савета універсітэта:**

***БУЛЫКА Святлане Лявонаўне*** - 5 курс 1 група факультэта права і эканомікі;

***РЭКЕЦЬ Наталлі Дзмітрыеўне*** - 4 курс 3 група факультэта псіхалогіі і педагогікі.

Асноўным напрамкам навуковай дзейнасці кафедры з'яўляецца даследаванне актуальных праблем гісторыі, эканомікі і культуры Беларусі. Даследуюцца і распрацоўваюцца наступныя тэмы:

а) гісторыка-дакументальныя кнігі-хронікі "Памяць" па гарадах і раёнах Гродзенскай вобласці; б) гісторыі гарадоў і вёсак Беларусі; в) гісторыя рэлігіі і царквы ў Беларусі; г) наш край - Гродзеншчына: гісторыя, эканоміка і культура.

Па кожнаму з навуковых напрамкаў дзейнасці кафедры за апошнія гады выкананы значныя аб'ёмы работы. Вялікія клопаты ў арганізацыі і правядзенні даследчыцкай працы членаў кафедры даводзіцца праяўляць загадчыку кафедры прафесару І.П. Крэню. Нядаўна выйшла з кіраўніцтвам дацэнта І.І.Коўкеля завершана работа па напісанню вучэбнага дапаможніка па курсу гісторыі Беларусі для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і аддзялення давузаўскай падрыхтоўкі. Першая частка падручніка ўжо выйшла з друку. Убачыў свет і вучэбны дапаможнік для студэнтаў гістарычнага факультэта "Крыніцы па гісторыі Беларусі". Аўтар - С.В. Палуцкая.

Акрамя вышэй пералічаных тэмаў і напрамкаў членамі кафедры вялася работа па распрацоўцы іншых праблемаў гісторыі Беларусі. Так, дацэнт С.Я.Сяльверстава працавала над праблемай уздзеяння палітыкі царызму на развіццё культуры ў Беларусі ў канцы 18 - першай палове 19 ст. Прафесар І.П.Крэнь, дацэнты І.І.Коўкель, М.В.Васілючак, У.А.Нядзелька, старшы выкладчык В.В.Калюта

***Як жывеш, кафедра?***

# ПІШАМ ГІСТОРЫЮ

**Напярэдадні 50-годдзя Вялікай Перамогі ветэранам нашага горада ўрачыста ўручылі незвычайны падарунак - кнігу "Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945". Амаль цалкам аўтарскі калектыў склалі члены кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Многія чытачы знаёмяцца не толькі з кнігай (дарэчы, плануецца яе перавыданне), але цікавяцца ўвогуле навуковай працай кафедры. Прапануем кароткі адказ на гэтае пытанне.**

друку кніга-хроніка "Памяць" па Гродзенскаму раёну. Здадзена ў друк і выйшла ўжо апрабацыю кніга-хроніка "Памяць" па Іўеўскаму раёну. У аўтарскім складзе -прафесар І.П.Крэнь і дацэнт М.В.Васілючак. У стадыі завяршэння знаходзяцца кнігі-хронікі "Памяць" па Бераставіцкім, Смаргонскім, Мастоўскім, Шчучынскім, Воранаўскім раёнах, завяршаецца праца ў гэтым кірунку па горадзе Лідзе і Лідскім раёне. Пры актыўным удзеле членаў кафедры падрыхтаваны аналагічныя працы па Дзятлаўскаму раёну. У напісанні гэтых кніг прымаюць удзел прафесар І.П.Крэнь, дацэнты І.І.Коўкель, І.А.Фёдараў, Э.С.Ярмусік.

Па тэме "Гісторыя гарадоў і вёсак Беларусі" выдадзена некалькі значных працаў, у тым ліку "Іўе. Гісторыка-эканамічны нарыс" (пад агульнай рэдакцыяй І.П.Крэня). Прафесарам І.П.Крэнем, дацэнтам І.І.Коўкелем падрыхтаваны артыкулы для энцыклапедыі па гісторыі Беларусі, адпаведна "Гарадзішча" і "Гродзенская вобласць", "Воранава" і "Воранаўскі раён". І.П.Крэнь з'яўляецца навуковым кансультантам энцыклапедыі гісторыі Беларусі.

Па тэме "Гісторыя рэлігіі і царквы Беларусі" на кафедры плённа працуюць дацэнты Т.Б.Блінова, С.В. Палуцкая, І.А.Фёдараў, аспірантка С.У.Дэйкалава. Дацэнт Т.Б.Блінова працуе над завяршэннем тэмы доктарскай дысертацыі "Езуіты ў Беларусі (канец 16 ст. - 1820 г.)". Дацэнт С.В.Палуцкая таксама рыхтуе доктарскую дысертацыю па тэме "Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Вялікага Княства Літоўскага". Аспірантка С.У. Дэйкалава працуе над кандыдацкай дысертацыяй па тэме "Праваслаўная царква на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945 гг.)". Дацэнт І.А.Фёдараў працуе над тэмай "Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай царквы на Гродзеншчыне ў 30-50-я гады 19 ст."

Адным з важных кірункаў дзейнасці кафедры з'яўляецца навукова-метадычнае забеспячэнне курса гісторыі Беларусі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У бягучым годзе выдадзены "Метадычныя парады і тэматыка кантрольных работ па гісторыі Беларусі" для студэнтаў усіх факультэтаў, "Метадычныя парады і тэматыка практычных заняткаў па гісторыі Беларусі" для студэнтаў усіх формаў навучання і інш. Калектыў кафедры ў апошнія гады працаваў над напісаннем тэкстаў лекцый па курсу гісторыі Беларусі для студэнтаў гістарычнага факультэта (са старажытных часоў да нашых дзён). Гэта работа ўжо практычна завершана. Пад кіраўніцтвам прафесара І.П.Крэня падрыхтаваны да выдання курс лекцый па гісторыі Беларусі (выходзіць у свет у мінскім выдавецтве "Універсітэцкае"), пад займаюцца праблемамі дзейнасці Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У цэлым, за апошнія гады члены кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы надрукавалі больш за 200 артыкулаў навуковага характару ў часопісах, матэрыялах навуковых канферэнцый, а таксама выдалі 7 вучэбных дапаможнікаў і некалькі кніг.

Важны аспект навуковай дзейнасці кафедры - удзел у навуковых канферэнцыях. Толькі ў 1993 годзе выкладчыкі кафедры прынялі ўдзел у міжнародных канферэнцыях "Рым - 4" у Гродне, "Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў грамадска-палітычнай, культурнай і адукацыйнай сферах" у Бресце, "Архіваводства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі" ў Мінску, "Нацыя і рэлігія" ў Гданьску. Навукоўцы прынялі ўдзел ва Усебеларускім кангрэсе гісторыкаў у Мінску і ў шэрагу іншых. За год члены кафедры ўдзельнічалі ў 19 міжнародных, 20 рэспубліканскіх, 14 рэгіянальных і 13 універсітэцкіх канферэнцыях, што сведчыць аб высокіх прафесійных магчымасцях навукоўцаў.

Асаблівай актыўнасцю ў гэтым плане вызначаюцца І.П.Крэнь, І.І.Коўкель, С.В.Палуцкая і С.Я.Сяльверстава. 1994-ы і бягучы год не былі выключэннем. Шырокі рэзананс выклікала міжнародная канферэнцыя па праблемах Арміі Краёвай. На ёй нашу кафедру прадстаўлялі 6 чалавек. На навуковую канферэнцыю, прысвечаную тэме "Беларусь у гады другой сусветнай вайны: урокі гісторыі і сучаснасць" кафедра вынесла 4 даклады. З 1990 па 1995 гады кафедра гісторыі Беларусі арганізавала і правяла пяць рэгіянальных гісторыка-краязнаўчых канферэнцый у Гродне, Воранаве, Ашмянах, Смаргоні, Шчучыне. Матэрыялы трох першых ужо выдадзены асобнымі кніжкамі. 31 мая адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная 40-годдзю гісторыка-краязнаўчага гуртка, які быў створаны прафесарам Я.Н.Марашам і якім ужо пяць гадоў кіруе прафесар І.П.Крэнь. Правядзенне яе сведчыць аб выніковай рабоце кафедры са студэнтамі. Другімі словамі, рыхтуем замену старэйшым. І падмуркам гэтай працы з'яўляецца гісторыка-краязнаўчы гурток, які дзейнічае пры кафедры.

Мы з аптымізмам глядзім у будучае, сталеем навукова і метадалагічна. На кафедры зараз 6 аспірантаў і 3 спашукальнікі.

У гэтым невялікім артыкуле мы паказалі толькі некаторыя аспекты навуковай працы членаў нашай кафедры.

*М.В.Васілючак, У.Я.Ягорычаў,*
*дацэнты кафедры*
*гісторыі Беларусі .*

***БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!***

# На "свежае" вока



*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

для патрэб універсітэта. Мабыць, атрымае тут прапіску музей Зофіі Налкоўскай. Будзе месца і для пасяджэнняў Саветы факультэта філалогіі. І вось адметная рыса, сугучная часу: побач з раскладам лекцый студэнтаў філфака — расклад заняткаў фальклорных гуртаў — спеўнага і танцавальнага. А яшчэ студэнтаў-філфакаўцаў вучаць майстэрству габелена, вышыўкі, ткацтва...

Прыемна было даведацца, што ў гэтыя дні на кафедры беларускай культуры працягваецца праца па стварэнні падручніка для студэнтаў. Аўтары "Археалогіі Беларусі" - выкладчыкі кафедры, дацэнты С.А.Піваварчык і Г.М.Семянчук. Гатовая да выпуску і чакае моманту ўбачыць свет у выдавецтве "Бацькаўшчына", чарговая кніга прафесара А.М. Пяткевіча "Літаратурная Гродзеншчына: мясціны, людзі, кнігі". Каб знайшоўся багаты фундатар, яна ўжо з'явілася б у кнігарнях, а пакуль што справа ўскладняецца з-за недахопу грошай.

Больш прадбачлівыя ў гэтым сэнсе навукоўцы з фізіка-тэхнічнага факультэта. Яны не толькі ўзяліся за стварэнне кнігі, але і знайшлі сабе фундатара. Паабяцаў фінансаваць выданне "Слоўніка фізічных тэрмінаў" былы старшыня калгаса з Іўеўскага раёна У.А.Баум. Дарэчы, бягучы год для фізіка-тэхнічнага факультэта надзвычай плённы. Дастаткова канстатаваць, што толькі сёлета тут абаронена адна доктарская і тры кандыдацкія дысертацыі і, як адзначалася на Міжнароднай канферэнцыі, якая тут нядаўна адбылася, у нас напрацаваны багаты вопыт і грунтоўная школа ў галіне оптыкі і лазернай фізікі, таму і месцам правядзення азначаных міжнародных канферэнцый на перспектыву абраны менавіта наш універсітэт.

У матэматыкаў - свой гонар, свае імёны: Станіслаў Сабалеўскі, Наталля Жыгала... Пра іх і іншых юных "піфагораў" мы яшчэ будзем весці гаворку. А падчас свайго першага наведвання факультэта мне надзвычай прыемна было пазнаёміцца з прафесарам Лідзіяй Уладзіміраўнай Кірылюк. Танюсенькай цікаўнай дзяўчынай, залатой школьнай медалісткай паступіла яна на фізмат педінстытута ў далёкім ужо 48-м годзе. Але і да гэтага часу, праз гады і жыццёвыя пуцявіны добра памятае ўзняты з пасляваенных руін гэты куточак роднага горада. Стоячы ля гэтых вось вялікіх вокнаў старога будынка, абмяркоўваючы са сваім выкладчыкам Нічыпарам Дзмітрыевічам Бяспамятных складанасці чарговай тэмы або курсавой працы, сціпла апранутыя і не надта пад'еўшыя, студэнты першых выпускаў умелі прыкмячаць і прыгажосць маладой зеляніны, і залаты кастрычніцкі лістапад, такі шчодры фарбамі, як сёлета. Лідзія Уладзіміраўна дзеліцца ўспамінамі, а я ўяўляю сабе, як у вялікія святы расчыняліся насцеж трое шырачэзных дзвярэй з 318 у 317 аудыторыю, і атрымлівалася актавая зала, як натхнёна хлопцы з фізмата гулялі і перамагалі на валейбольнай пляцоўцы, у дворыку пад самымі вокнамі інстытута; як шпарка шыбаваў па калідоры студэнт выпускнога курса Аляксей Карпюк, старшыня студэнцкага прафкама, як заўзята, з прысутнай яму настойлівасцю і спагадай, некага ўладкоўваў у інтэрнат, для некага дамагаўся грашовай дапамогі.

Цяжкі быў той пасляваенны час. Не было на чым пісаць, не хапала падручнікаў. Кніжны фонд педінстытута збірала ў 40-ыя гады бадай што ўся краіна. З Сібіры і Далёкага Усходу ішлі пасылкі з літаратурай у толькі што вызвалены Гродна. Можа, менавіта тады і з'явіліся ў нас кнігі, на якія сёння хочацца паглядзець як на бібліяграфічны цуд. Уявіце сабе, у фондзе універсітэцкай бібліятэкі сёння - "Философ Английской или житие Клевеланда" 1761 года, "Синтаксис латинский, изданный для употребления Российского юношества" 1780 года, "Путешествие из Петербурга в Москву" Радищева, издательства 1790 года, "История государства Российского" 1834 г., "Анекдоты князя италийского графа Суворова" 1827 г., "Военное искусство" Макіявелі 1839 г., "Документы, объясняющие историю западно-русского края и его отношение к России и Польше" 1865 года... Пералік гэты можна працягваць яшчэ і яшчэ - дзесяткі, сотні інтрыгуючых назваў. Маё "свежае" вока не пераставала здзіўляцца гэтаму багаццю, а ці ведаюць пра яго нашы гісторыкі, матэматыкі, філолагі, правазнаўцы?

Наведаўшы бібліятэку, параўноўваю яе з вясновым вуллем. Увесь дзень тут шматлюдна. Дарэчы, нехта са спецыялістаў неяк падлічыў, што за працоўны дзень адзін работнік бібліятэкі універсітэта абслугоўвае больш як 100 чалавек, пры гэтым пераадольвае шлях у 18 кіламетраў, пераносіць каля тоны грузу.

А не так даўно бібліятэка папоўнілася. Не, не ад кнігагандлю. Сем'і былых выкладчыкаў, якіх сёння няма ўжо з намі, перадалі універсітэту даволі змястоўныя і каштоўныя хатнія бібліятэчкі. Некалі, год за годам, іх папаўнялі Ніна Васільеўна Тарэлкіна і Сямён Аляксандравіч Грыгор'еў. Зараз кнігамі могуць карыстацца студэнты і выкладчыкі.

Нязвыклую нязручнасць адчулі ў сярэдзіне кастрычніка ўсе супрацоўнікі універсітэта. Не чуваць было настойлівых тэлефонных званкоў, не накручваліся дыскі апаратаў. Тэлефоны ўпарта замерлі на цэлы тыдзень і нікога нельга было вінаваціць за гэта. Хіба што толькі сам час, у які жывем, і аб'ектыўныя абставіны. З-за недахопу грошай мы апынуліся ў пазыцы ў сувязістаў, і яны ўрэшце рэшт адключылі нашы нумары. Зараз перад адміністрацыяй універсітэта ўсур'ёз паўстала пытанне забяспечыць ВНУ унутранай сувяззю, адмовіўшыся ад часткі

*(Заканчэнне на 5-й стар.)*



### *Аднаўленая традыцыя*

# *КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ*

У 60-я гады, у тады яшчэ Гродзенскім педінстытуце імя Янкі Купалы,была слаўная традыцыя - правядзенне Купалаўскіх чытанняў. Зараз, у год юбілейны — 90-годдзя з пачатку дзейнасці і 70-годдзя прысваення звання народнага паэта - у Гродзенскім дзяржуніверсітэце адноўлена былая традыцыя. 4-5 кастрычніка адбылася навуковая канферэнцыя, Купалаўскія чытанні, якія мяркуецца праводзіць штогод.

Як на сённяшні час, дык гэтая канферэнцыя была даволі прадстаўнічай: з Польшчы прыехаў вядомы пісьменнік, публіцыст, літаратуразнаўца Сакрат Яновіч. Яго даклад "Канец Купалавай уявы нацыі" выклікаў надзвычайную цікавасць удзельнікаў канферэнцыі. Белдзяржуніверсітэт быў прадстаўлены вядомым літаратуразнаўцам К.Р. Хромчанкам і маладым даследчыкам П. Навойчыкам, даклад якога "Янка Купала і "Наша ніва" ўзняў шэраг дыскусійных пытанняў у сувязі з роляй паэта ў існаванні гэтай газеты. З цікавымі дакладамі выступілі вучоныя з інстытута літаратуры АН Беларусі М. Мікуліч і Д.Санюк. Брэсцкі педуніверсітэт прадстаўлялі літаратуразнаўцы Ц. Ліякумовіч і Г. Праневіч, якія зрабіў цікавую спробу рэабілітацыі "Ляўкоўскага цыклу" і культаўскіх вершаў Купалы.

Быў праслуханы цэлы шэраг дакладаў навукоўцаў Гародні, гаспадароў канферэнцыі. Прафесар А.Пяткевіч гаварыў пра паэзію Купалы як пра нацыянальную духоўную каштоўнасць, дацэнт К.Лецка - пра рамантызм Купалы ў ацэнцы С.Палуяна і М. Багдановіча. Даклад І. Жука "У перакрэсці гісторыі (назіранні вакол "Тутэйшых" праз літаратурныя ацэнкі 20-х гадоў)" вызначаўся своеасаблівым поглядам і характэрнай для даследчыка арыгінальнасцю пры аналізе крытычнай думкі тых гадоў наконт п'есы "Тутэйшыя". Незвычайным па свайму зместу быў даклад літаратуразнаўцы, вядомага паэта Ю.Пацюпы "Зайгранне або ярныя (эратычныя) матывы ў ранняй творчасці Янкі Купалы і Максіма Багдановіча". Лінгвістычны аналіз мовы твораў Янкі Купалы прафесійна выканаў у сваім дакладзе вядомы мовазнаўца прафесар І. Лепешаў.

Прыемна ўражвае і тое, што творчасцю Купалы пачалі займацца і прадстаўнікі дакладных навук. З дакладам "Асэнсоўванне літаратурнай спадчыны Янкі Купалы на фоне сучаснага грамадскага стану Беларусі" выступіў доктар тэхнічных навук А. Саламонаў, які вось ужо некалькі гадоў займаецца вывучэннем і прапагандай беларускай літаратуры.

Цудоўнае надвор'е, цёплае сонейка, няхай ужо і асенняе, цікавая экскурсія па гораду, у музей М.Багдановіча, спадзяёмся, спрыялі найлепшым уражанням удзельнікаў канферэнцыі, што прыехалі ў старажытную Гародню.

*Ала Петрушкевіч,*
*адказны сакратар*
*аргкамітэту Купалаўскіх*
*чытанняў.*

# Будзе мроіцца Амерыка…

Абавязкова будзе! Бо як красамоўна, як захапляюча апавядалі пра цудоўны год, праведзены ў Амерыцы, дзве абаяльныя мінскія студэнткі Вольга і Паліна. Жылі яны ўвесь год у амерыканскіх сем'ях, вучыліся з амерыканскімі падлеткамі, спасцігаючы іншы свет, іншыя норавы, уклад жыцця. Нават... працавалі, бо там школьнікі і студэнты працуюць, хоць гэта праца, вядома ж, катэгорыя ўмоўная. Вольга і Паліна былі запрошаны ў наш універсітэт на прэзентацыю праграмы міжнароднага абмену студэнтамі і школьнікамі. У свой час ім пашчасціла быць абранымі для паездкі за мяжу па праграме Амерыканскага савета па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі і вывучэння моваў (ACCELS). Зараз такая магчымасць надарылася траім студэнтам нашага універсітэта, і сёння яны - у Амерыцы. Пашчасціцца можа тым, хто дасканала ведае англійскую мову і пройдзе неабходнае тэставанне. Анкеты-тэсты з'явяцца ў ГрДУ у лістападзе (сачыце за аб'явамі!). А ўсе даведкі можна атрымаць па мінскім тэл. 0-172-36-67-46.

*С. Іванова.*

# Увагу - праграмам

Як вядома, наш універсітэт рыхтуецца да атэстацыі і з гэтай нагоды патрабуе ўдасканалення такі немалаважны аспект дзейнасці ВНУ,як практыка падрыхтоўкі вучэбных і рабочых праграм.

Акрэслена кола грунтоўных праблем і пытанняў, якія ў апошні час зацікаўлена абмяркоўваюцца і рэктаратам і дэканатамі. На думку загадчыцы навукова-метадычнага аддзела Т.А.Бадзюковай, сітуацыя і ў гэтым вучэбным годзе склалася ва універсітэце няпростая, але калектыўна ўсе гэтыя праблемы і пытанні вакол складання вучэбных і рабочых праграм можна вырашыць станоўча. Да таго ж, маецца і пэўны вопыт у гэтай справе, у прыватнасці, нядрэнныя напрацоўкі ёсць на кафедрах, якімі загадваюць Г.Я.Гайдашаў, І.Д. Разэнфельд, Ч.С.Кірвель, М.У.Сільчанка.

У навукова-метадычным аддзеле маюцца рэкамендацыі і ўзоры афармлення і складання праграм, таму кіраўнікам кафедраў трэба толькі праявіць больш ініцыятывы і зацікаўленасці, каб усе рабочыя і вучэбныя праграмы былі не толькі добра прыстасаваны да спецыфікі факультэтаў, але і адпавядалі іншым немалаважным патрабаванням.

*С. Бераст.*

# На юбілей - у Беласток

Нядаўна дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе прафесара І.П. Крэня, дэкана гістарычнага факультэта, і дацэнта Т.А. Бадзюковай, начальніка вучэбна-метадычнага аддзела, пабывала на юбілейных урачыстасцях з нагоды 60-годдзя прарэктара Беластоцкага філіяла Варшаўскага універсітэта Уладзіслава Серчыка. Сустрэча была плённай, бо навукоўцам дзвюх суседніх краін было аб чым пагаварыць. А на ўрачыстасцях прысутнічалі рэктар Варшаўскага універсітэта, віцэ-прэм'ер Польскай акадэміі навук, Беластоцкі ваявода, консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку, дырэктар Польскай нацыянальнай бібліятэкі, вядомыя вучоныя з Варшавы, Кракава, Познані. Юбіляр, прафесар Серчык вядомы ў Польшчы і за мяжой як добры спецыяліст па гісторыі Украіны, дарэвалюцыйнай Расіі. Ён выдаў больш як 30 манаграфій.

За вялікі ўклад у развіццё гістарычнай навукі і ў выхаванне моладзі ваявода аб'явіў аб прысваенні яму звання "Ганаровы грамадзянін Беласточчыны". Нямала цёплых слоў сказалі ў адрас юбіляра і прадстаўнікі нашага універсітэта. Прафесар Ул.Серчык нямала зрабіў для ўстанаўлення і развіцця навуковага супрацоўніцтва і студэнцкага абмену паміж Беластокам і Гродна. Пажадаўшы юбіляру моцнага здароўя і найлепшых поспехаў у навуковай і адміністрацыйнай працы, прафесар І.П.Крэнь выказаў пажаданне, каб хутчэй Беластоцкі філіял Варшаўскага універсітэта ператварыўся ў самастойную вучэбную ўстанову. Гэта будзе садзейнічаць далейшаму сумеснаму супрацоўніцтву двух буйных рэгіянальных навуковых цэнтраў — Беластока і Гродна.

*Т. Бадзюкова.*

**11-12 октября в Минске состоялся II съезд Федерации профсоюзов Беларуси. Мы попросили делегата съезда, председателя профкома В.А. Хилюту кратко поделиться своими впечатлениями о работе высшего форума профсоюзов. Вот его записи, сделанные специально для "Гродзенскага універсітэта".**

*СЛОВО ДЕЛЕГАТА*

# НАШИ ВОПРОСЫ РЕШАТЬ НАМ

Условно работу съезда можно разбить на два этапа. В первый день делегаты от отраслевых и региональных объединений профсоюзов встретились с руководителями министерств, центральных органов управления, Кабинета Министров Республики Беларусь. В нашей отрасли такая встреча произошла с Министром образования и науки Стражевым Василием Ивановичем.

Кратко суть встречи можно свести к следующим основным моментам: положение в отрасли катастрофическое, система образования и науки финансируется по остаточному принципу, строительство новых объектов на предстоящий год консервируется, бюджет на 1996 год не вырисовывается. Так что вывод, уважаемые читатели, делайте сами...

Справедливости ради следует отметить, что в выступлении министра прозвучали и нотки оптимизма. Подготовлен Указ Президента по науке, в соответствии с которым высшая школа освобождается от налогов на прибыль. При Президенте создается фонд поддержки высшей школы и науки, а также фонд поощрения лучших студентов. В то же время студенты, имеющие тройки, стипендии получать не будут. Забегая вперед, замечу, что эти моменты отмечались в выступлении Президента на съезде.

Во второй день состоялось пленарное заседание, на котором с отчетным докладом выступил председатель ФПБ В.И. Гончарик. Из-за экономии газетной площади отмечу лишь главное. И в самом докладе, и в выступлениях делегатов звучала тревога о недопустимости дальнейшего снижения жизненного уровня людей, забота о том, чтобы работающий человек получал достойную трудового вклада заработную плату, а наиболее незащищенные слои - пенсионеры, дети, студенты - имели бы от государства гарантированную поддержку.

На съезде ФПБ было много гостей, представленных профсоюзными лидерами как стран ближнего, так и дальнего зарубежья: России, Украины, Молдовы, Казахстана, Таджикистана, Польши, Германии, Финляндии, Китая и др.

Перед делегатами съезда с большой речью, которая длилась более 1,5 часа, выступил Президент РБ Александр Григорьевич Лукашенко. Скорее всего его встреча с делегатами съезда была задумана как большой совет, о чем убедительно свидетельствовал тот факт, что на высшем профсоюзном форуме присутствовал премьер-министр РБ М.Чигирь вместе со своими министрами, а также представители администрации Президента.

Выступление Президента, на мой взгляд, было не просто каким-то очередным конъюнктурным политическим мероприятием, а носило характер серьезного разговора, от которого все общество вправе ожидать сильного импульса к общественной стабильности и согласию. У меня лично сложилось впечатление, что в этой непростой экономической и социально-политической ситуации, которая характерна для республики, Президент ищет поддержки у самой массовой общественной организации страны, он сверяет свою программу действий. II съезд профсоюзов для него, образно говоря, и явился той "лакмусовой бумажкой", которая должна была дать реакцию на его политические очаги. Поскольку отдельные фрагменты выступления Президента на съезде были показаны по телевидению и опубликованы в печати, я не буду подробно останавливаться на выступлении главы государства. Отмечу лишь то, что выступление Президента было искренним, откровенным по своему характеру. А.Лукашенко не скрывал трудностей, не пытался уйти от острых, я бы даже сказал, не совсем удобных для него вопросов: отмена льгот, пенсионный указ, перемещение кадров, противостояние администрации Президента и старого Верховного Совета и др. Несмотря на деловой и порой жесткий стиль разговора Президента с делегатами съезда, встреча в целом тем не менее оставила впечатление теплоты и душевности. Делегаты съезда выслушали речь Президента с большим вниманием, не со всеми его высказываниями были согласны и в конце выступления главы государства аплодировали не его ораторскому мастерству, а скорее всего, выразили свое согласие с его стратегической линией на проведение преобразований в республике.

На съезде была принята Программа действий ФПБ на ближайший период, в центре которой стоит защита интересов человека труда и малоимущих слоев населения, были внесены изменения в Устав ФПБ, принята резолюция о заработной плате, предусматривающая ее статус первоочередного платежа, а также резолюция по проблемам обороны и защиты здоровья населения РБ.

Делегаты съезда избрали новый состав совета ФПБ в количестве 247 человек, в который попал и Ваш "покорный слуга". Председателем СФПБ вновь избран В.И. Гончарик. Итак, съезд завершился. Чуда не произошло. Старая профноменклатура осталась у власти. Надеяться на защиту руководства СФПБ не приходится. Ведь это именно при ее молчаливом согласии бывшее правительство Кебича В.Ф. лишило профсоюзы права законодательной инициативы, изъято управление социальным страхованием, прекращены наши полномочия в области управления производством и распределения прибыли. Началось сокращение прав в области трудовых отношений. В этих условиях мы не должны уподобляться и действовать по примеру некрасовского персонажа "вот приедет барин, барин нас рассудит". Никакая власть, никакое правительство, никакие профсоюзы не решат за нас наши вопросы. Каждый из нас должен осознать свое место и роль в обществе, мы не должны быть лишь "винтиками" единого государственного механизма, ключ от которого находится в чьих-то руках. Пора каждому из нас занять твердую, честную, активную и принципиальную позицию по всем коренным жизненным вопросам. Пора, как говорил классик, "людьми зваться". Свои жизненные вопросы мы должны решать за себя. Таковы первые мои впечатления от работы II съезда ФПБ.

*В.Хилюта,*
*председатель профкома.*

**От редакции:** Поздравляем Владимира Андреевича с избранием его в Совет Федерации профсоюзов Беларуси, надеемся, что это положительно отразится и на делах нашего университета. Кстати, председатель профкома любезно пообещал, что в ближайших номерах нашей газеты он продолжит разговор о профсоюзной жизни. Речь пойдет о конкретных наболевших вопросах, затрагивающих интересы каждого, кто работает или учится в университете.

*БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!*



# На "свежае" вока

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 3-й стар.)

гарадскіх нумароў.

На вялікі жаль, не толькі сувязістам мы запазычылі. На адным з кастрычніцкіх пасяджэнняў рэктарата прагучалі ўнушальныя лічбы нашых пазыкаў. Таму сёння найбольш востра паўстае праблема, як жыць эканомна, па сродках. Добра, што ў калектыве ГрДУ ёсць нямала дбайных ашчадных гаспадароў. Напрыклад, інжынер па энергагаспадарцы В.Л.Колб. Чалавек выдатна ведае сваю справу, умее бачыць перспектыву. Надарылася магчымасць, і ён не ўпусціў яе, забяспечыўшы універсітэт лічыльнікамі цяпла. Зараз 9 будынкаў з 13 імі ўжо абсталяваныя. Першыя чатыры, устаноўленыя ў пачатку года, акупілі сябе на працягу месяца, расказвае Віталь Львовіч. Дзякуючы гэтым прыборам, у ацяпляльны сезон мы штомесяц можам эканоміць каля 60 мільёнаў рублёў. Аднак не хапае ў гэтай службе дбайных спецыялістаў-сантэхнікаў для абслугоўвання цеплассеткі універсітэта. Зноў жа, няма грошай... У першы ж свой працоўны дзень я звярнула ўвагу на цьмянае асвятленне калідораў і лесвіц. Віталь Львовіч растлумачыў: і гэта дзеля эканоміі, вымушаныя шукаць рэзервы. Ды толькі не ўсе гэта разумеюць. Здараецца, у аудыторыях і кабінетах забываюцца выключыць асвятленне, і накручваюцца кілаваты, ператвараючыся ў кругленькую суму, гэта ў той час, як работнікі сталоўкі мыюць посуд халодназ вадой. Зноў жа -вымушаная мера. Не было чым заплаціць - і перакрылі крыніцу гарачага водазабеспячэння.

Студэнцкая сталоўка. Самая прыцягальная "аудыторыя" ва ўсе часы, асабліва пасля стыпендыі.Я зайшла туды не ў лепшы для студэнцкага кашалька час. Дзесятак першакурснікаў з канспектамі "абляпілі" адзін обедзенны стол.Пытаю, ці падабаецца ім тут харчаванне, якія праблемы сталоўкі найбольш іх засмучаюць? Адказ быў лаканічны: "Адсутнасць грошай". І як пацвярджэнне таму - дзве пустыя шклянкі ад гарбаты на ўсю кампанію за сталом.

Памятаю і падзяляю заклапочанасць прафесара А.Пяткевіча. На яго думку, у нас, і не толькі ў нас, назіраецца тэндэнцыя згортвання навучання па-беларуску, скрачаецца гуманітарная праграма, менш гадзін адводзіцца на вывучэнне гісторыі беларускай культуры на асобных факультэтах універсітэта. Мяне ж асабіста ўразіла іншае. Напрыклад, пасяджэнне рэктарата Л.М. Ківач вядзе на беларускай мове. Тут выказваюць сваю думку па-беларуску не толькі філолагі. Добрае валоданне ёю адзначыла я, пабываўшы на пасяджэннях рэктарата, у дэкана матэматычнага факультэта і ў дэкана фізіка-тэхнічнага. Паведамленні на дошцы аб'яў таксама, у большасці сваёй, на беларускай мове. І шыльда на дзвярах - таксама. Справаводства універсітэта, падалося мне на "свежае' вока, таксама мае тэндэнцыю да беларускасці. Вось і нядаўна на рэктарацe абмяркоўвалася "Палажэнне аб размеркаванні надбавак за працу" — і таксама па-беларуску.

Вось і пазнаёміліся. Мне прыемна і ганарова ўваходзіць у вялікі калектыў Гродзенскага універсітэта. Ужо ў першыя дні я адчувала ўсюды, куды б не зайшла, якія цікавыя, змястоўныя, адданыя справе людзі працуюць тут. Прыемна, што ў большасці сваёй - небаюся паўтарыцца — добразычлівыя, спагадлівыя, далікатныя. Спадзяюся, мы знойдзем агульную мову. Спадзяюся на вашу падтрымку і дапамогу ў стварэнні газеты універсітэта, якая, у сваю чаргу, будзе спрыяць і вашым справам.

*З павагай і надзеяй*
*рэдактар газеты*
*"Гродзенскі універсітэт"*
*Святлана Мурына*



*Канферэнцыі*

# НЕЎМІРУЧАЯ АНТЫЧНАСЦЬ

*І ўсё змянілася, і ўжо пра іх забылі,*
*Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі...*

***М. Багдановіч***

**Кожны год у пачатку лета ў Маскве працуе канферэнцыя Асацыяцыі антыказнаўцаў. Раней яна называлася Усесаюзнай, цяпер - Расійскай, але ў ёй ёсць і вучоныя з усяго СНД, прыязджаюць і з дальняга замежжа. Пасяджэнні канферэнцыі заўсёды цікавыя для антыказнаўцаў, якія тут сустракаюцца з апошнім словам сваёй навукі. Аднак тэма 1995 года выйшла далёка за межы старажытнасці і выклікала цікавасць з боку ўсіх гісторыкаў, усіх, хто чытае і вучыцца: "Антычны свет і яго лёс у наступныя стагоддзі".**

"Часта думаюць, - сказала ва ўступным слове прэзідэнт Асацыяцыі Алена Сяргееўна Галубцова, - што антычны свет ужо сказаў свае слова, аднак гэта памылка. Антычны свет працягвае жыць, жыве і ў сучаснасці". І гэта добра паказала канферэнцыя.

Антычнасць жыве ў тэрмінах і паняццях усіх еўрапейскіх і многіх нееўрапейскіх моваў, да гэтай пары ўдакладняецца іх антычнае значэнне і далейшая эвалюцыя. Усё новыя і новыя археалагічныя адкрыцці, іншы раз сенсацыйныя, шматлікія эпіграфічныя помнікі прымушаюць працягваць раскопкі, робяць з антыказнаўства навуку, якая развіваецца пастаянна.

Паколькі грэчаскі, а затым рымскі свет, уключаючы тэрыторыі старажытнага Усходу, ахапіў значную частку "айкумены", гэта значыць, населенага зямнога сусвету, кожная краіна, якая займала месца ў гэтым сусвеце ці сутыкалася з ім, мае сваю антычную гісторыю. У межах вывучэння гісторыі і культуры старажытных Грэцыі і Рыма антыказнаўцы розных краінаў даследуюць і іх антычнае мінулае. Сляды антычнай культуры асабліва жывыя ў Італіі, Грэцыі і ўсіх краінах Балканскага паўвострава, напрыклад, у Балгарыі, у Малой Азіі, на пабярэжжах Міжземнамор'я і ў Прычарнамор'і. Жыццё антычнасці ў паэзіі добра паказаў даклад "Апалонаўскае і дыанісійскае ў паэзіі А.С.Пушкіна", мы даведаліся аб новым у піфагарэйстве і раннім хрысціянстве. Шэрагам прайшлі перад намі ў ацэнках гістарыёграфаў такія асобы, як Аляксандр Македонскі, Цэзар, Цыцэрон, Каціліна, Брут, Спартак і Серторый. Іх па-рознаму ацэньваюць, з імі параўноўваюць, вылучаючы, напрыклад, узнёслыя мэты і ганебныя сродкі: як часта гэта паўтаралася ў гісторыі! І кожная нацыянальная гістарыяграфія звяртае ўвагу на якуюсьці сваю ідэю : напрыклад, нямецкая - на значэнне асобы, наша - на сацыяльныя пытанні, а цяпер - на тэму "полісу" , амерыканская - на тэму свабоды, рабства і іх прамежкавых формаў, часта - у сувязі з антычнасцю сваіх краінаў. А якія сувязі з антычнасцю Беларусі? Гродзеншчыны?

Я абрала сабе тэму "Антычнасць у фондах каралеўскага замка", і мой даклад, вынесены на другое пленарнае пасяджэнне, завяршаў канферэнцыю. Гаворачы аб "фондах каралеўскага замка", я, канешне, мела на ўвазе Аддзел рэдкай кнігі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. І трэба сказаць, гэтая тэма была не вельмі лёгкай, таму што адрознівалася ад звычайнай антычнай тэматыкі. Дапамагло тое, што я некаторы час працавала ў гэтым аддзеле, азнаёмілася з фондам. Загадчыца аддзела В.І.Шоцік, яго супрацоўніцы А.Саўчук і Л.Коўкель дапамаглі з літаратурай, паведамілі аб гісторыі бібліятэк Гродзеншчыны і фондах гэтага аддзелу. Аднак у маім дакладзе я гаварыла не толькі аб кнігах.

Трэба было коратка азнаёміць слухачоў з Гродна, яго замкамі і антычнымі традыцыямі Гродзеншчыны. Раскопкі паказваюць, што ўжо з пачатку І тысячагоддзя плямёны Заходняй Беларусі падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з рымскімі правінцыямі Заходняй Еўропы, а таксама са скіфамі Ніжняга Прыдняпроўя. Знойдзены рымскія дынарыі І-ІІІ ст., манеты Баспора і Фракіі, гліняныя антычныя амфары і шкляныя пацеркі, а затым ужо мясцовыя вырабы, зробленыя па антычных узорах.

У старажытнасці ведалі раку Нёман. У ІІ ст. н.э. называлі яе "Рувонай" ці "Рудонам", а параўнальна невялікую раку, якая каля Нёмана ўпадае ў мора, Прэголу, — "Хронасам". Аднак спадарожнікі - крыніцы географаў, былі вельмі недакладнымі, і, калі меркаваць па Плінію (І ст. н.э.), яшчэ раней, а затым і пазней, таксама і Нёман называлі Хронам ці Кронам, магчыма, лічачы Прэголу працягам Нёмана, гэта значыць, адной ракой. Ва ўсякім разе Апіян Марцэлін (IVст.) піша толькі аб дзвюх вялікіх рэках гэтай часткі басейна Балтыкі: гэта "Вастуля" (Вісла) і "Хроніус" (напэўна, Нёман). Назвы рэкаў рымляне любілі ўзгадняць са словам "flumen" (рака) ніякага роду, і Хрона-Кронас ператвараўся ў "Кронон" з канчаткам - он ніякага роду. Такім яно перайшло ў сярэднія вякі, і ў XVI ст. аўстрыйскі дыпламат З.фон Герберштэйн, які праязджаў гэтыя мясціны па шляху ў Маскву, напісаў: "Кронон течёт около города Гродно... на местном языке он называется Неманом".

Адкуль гэтая назва? Нямецкія вучоныя, гаворачы аб Прэголе, выводзілі яе ад старанямецкага "hrono", што азначае "падаць уніз". Але маецца старажытнагрэчаскае слова "крунос" - гэта азначае "фонтан","ключ", што нядрэнна падыходзіць да віраў Нёмана. Але потым, напэўна, па сугуччу, апісальныя назвы аб'ядналі з багамі: Хронасам, богам часу, ці Кронасам, патрыярхам алімпійскага пантэона, ці з абодвума, таму што рымляне часта іх атаесамлялі. І быў наш Нёман "кранійскай", боскай ракой.

Элементы антычнасці прынесла з Візантыі ўсходняе хрысціянства, калі "Гарадзень" быў сталіцай удзельнага княства. Будаваліся кляштары і цэрквы, у тым ліку, і наша жамчужына з XII стагоддзя Каложа, а пры цэрквах і кляштарах адразу ж узнікалі невялікія бібліятэкі рукапісных богаслужэбных кніг - пераклады са старажытнагрэчаскай на царкоўнаславянскую мову. На пергаменце перапісваліся евангеллі, сярод іх "Гродзенскае", "Ваўкавыскае", "Сухавіцкае" і знакамітае "Лаўрышаўскае". У яго ініцыялах і мініяцюрах мастацтвазнаўцы знаходзяць водгаласы элiністычнага мастацтва. Аднак вельмі мала што з гэтых рукапісаў захавалася.

Гродзеншчына ўвайшла ў склад Вялікага Княства Літоўскага, затым у склад Рэчы Паспалітай. Таму рэнесанс з яго адраджэннем антычнай культуры прыйшоў сюды ў XV стагоддзі з захаду. Горад упрыгожыўся пабудовамі ў стылі рэнесанса. Напрыклад, Стары замак перабудаваны пры Стэфане Баторыі. У каталіцкіх і праваслаўных школах прыкладная праграма навучання ў XVI-XVIII стагоддзях пераймала прынцыпы школ старажытнага свету і складалася з "сямі свабодных мастацтваў".

Лацінская мова была мовай або прадметам навучання, і навучэнцы не толькі чыталі старажытных аўтараў, але і свабодна размаўлялі на латыні, чыталі трактаты. Традыцыі антычнасці нясла і рэфармацыя. Звяртанне да заходняй культуры называлі звяртаннем да культуры "лацінскай". Затое праваслаўныя называлі сябе людзьмі "старажытнагрэчаскага веравызнання".

Многія юнакі з Беларусі, дзякуючы веданню лацінскай мовы, маглі паспяхова вучыцца ва ўсіх універсітэтах Заходняй Еўропы. Сярод іх былі пасля вялікія мысліцелі-гуманісты: Францыск Скарына, Сымон Будны, браты Зізаніі, паэт-лацініст Мікалай Гусоўскі і шмат іншых. На Захадзе вучыліся і выхадцы з Гродзеншчыны. Вяртаючыся, яны прыносілі ў грамадства павагу да антычнай культуры. І яны, і купцы прывозілі шмат кніг, у тым ліку і старажытных аўтараў, і "кнігу-лацінку" з самых розных галін ведаў.

Гродзеншчына вядомая сваімі бібліятэкамі. Яны меліся пры цэрквах, кляштарах, школах, у вялікіх князёў і магнатаў, у шляхты, найбольш заможных гараджан. І заўсёды значную частку бібліятэк складалі кнігі старажытных аўтараў і кнігі-лацінкі. Яны выдаваліся і ў мясцовых друкарнях, асабліва шмат у Полацкай калегіі (з 1812 г. акадэміі) езуітаў, адкуль шмат кніг прыбывала і ў Гродна. Былі "антычныя" кнігі ў "Бібліятэцы апошняга Ягелона", частка якой у 1642 г. з'явілася ў Гродне, а таксама ў бібліятэцы езуітаў, якая затым была перададзена дамініканам і даведзена ў XIX стагоддзі да 10000 тамоў. Яшчэ 8000 тамоў было сабрана ў кляштарах. Папаўняліся прыватныя бібліятэкі. Напрыклад, у бібліятэцы Радзівілаў у Нясвіжы было сабрана каля 20000 тамоў, багатыя бібліятэкі былі ў Сапегаў у Дзярэчыне, Патоцкіх - у Рудні, Тышкевічаў і Пуслоўскіх - у Свіслачы, Агінскіх - у Слоніме і Залессі, Храптовічаў у Шчорсах. У Шчорсах займаліся ў пачатку XIX стагоддзя Ян Чачот, Іяхім Лелявель і Адам Міцкевіч, які потым у Лазане чытаў у 1839-1840 гадах курс лацінскай літаратуры.

Лёс большасці кніг, на жаль, трагічны. Войны, падзелы тэрыторый, паўстанні, іх падаўленне, аб'яднанні і раз'яднанні суправаджаліся не толькі палітай крывёю, але і незлічонымі матэрыяльнымі стратамі, у тым ліку, стратамі культурных каштоўнасцяў. У 1581 годзе езуітамі былі публічна спалены кнігі, забароненыя каталіцкай царквой. Пасля фактычнай ліквідацыі царкоўнай уніі на нашых землях у 1839 годзе была знішчана старадаўняя

бібліятэка Жыровіцкага кляштара, які ў той час быў уніяцкім, а бібліятэка уніяцкага кляштара базіліянаў была "арыштавана", схавана ў шафы, забітыя дошкамі, і пасля згінула.

Пасля паўстанняў у 1831-1864 гг. знішчаліся кнігі каталіцкіх кляштароў. У першую сусветную вайну кнігі расцягвалі нямецкія акупанты і ў апошнія дзесяцігоддзі нямала страт панеслі бібліятэкі з-за змяненняў у палітыцы і ідэалогіі. На шчасце, ва ўсе часы, якія б віхуры не руйнавалі бібліятэкі, хоць нейкую іх частку ўдавалася выратаваць.

У 1825 годзе вялікая дамініканская бібліятэка ў Гродне была перададзена дамініканскай гімназіі, а ў 1834 годзе - яе пераемніцы Гродзенскай мужчынскай класічнай гімназіі. Тут старажытныя аўтары і лацінскія кнігі занялі пачэснае месца, бо выкладанне старажытных моваў вялося на высокім узроўні. Дастаткова адзначыць, што ў канцы XIX стагоддзя тут выкладалі сем выпускнікоў Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага факультэта. Сярод іх - ураджэнец Гродзеншчыны, выдатны педагог, аматар і захавальнік старажытных кніг Яўстафій Філарэтавіч Арлоўскі. Выпускнікамі Гродзенскай гімназіі былі знакамітыя знаўцы антычнасці. Гэта акадэмік В.В. Латышоў (1855-1911 гг.) - гісторык-этнограф з сусветным імем. Яго выданні грэчаскіх і лацінскіх надпісаў Прычарнамор'я сталі настольнай кнігай антыказнаўцаў і асновай для ўсіх наступных выданняў. Нельга не назваць і імя акадэміка А.В. Макавельскага (1884-1969 гг.), ураджэнца Гродна, вядомага гісторыка антычнай і ўсходняй філасофіі. Гэта ён упершыню выдаў на рускай мове фрагменты антычных філосафаў-дасакратыкаў, сафістаў і атамістаў, а таксама Авесту - свяшчэнную кнігу старажытных іранцаў.

У пачатку XX стагоддзя ў Гродне ўжо меліся грамадскія бібліятэкі: публічная - папярэдніца бібліятэкі імя Карскага, медыцынская, яўрэйская і іншыя.

У 1920 годзе створаны Гродзенскі гістарычны музей, а пры ім і бібліятэка. Старыя кнігі, згубленыя ў час вайны і перамены ўлады, стаў збіраць дырэктар музея, вучоны-краязнаўца, гісторык і археолаг Юзеф Ядкоўскі (1890-1950 гг.). Ён знаходзіў кнігі па гарышчах і ў падвалах, у лаўках, дзе ў кніжную паперу загортвалі прадукты. Знайшліся аднадумцы, якія дапамагалі яму ў гэтых пошуках, неслі ў музей старыя каштоўныя кнігі. Графіня Марта Красінская-Пуслоўская падарыла музею цэлую бібліятэку - каля 10000 тамоў. З цягам часу гэта бібліятэка мела ўжо 40000 тамоў. У гады Вялікай Айчыннай вайны музей і яго фонды былі захаваны дзякуючы намаганням Б.Шушкевіча, які загінуў пасля ў лагеры смерці. А кнігі, схаваныя ў тоўстых сценах Старога замка, у сырых, без ацяплення памяшканнях, псаваліся. На гэтай падставе іх пасля выбракоўвалі, хоць старыя рукапісы і кнігі былі надзвычай каштоўнымі.

Музей пашыраўся, але для літаратуры не было месца. Кнігі, зваленыя, як прыйдзецца, бо не хапала месца ў шафах, далей прыходзілі ў нягоднасць, незапатрабаваныя нікім, акрамя некаторых вучоных.

У 1991 годзе абкам партыі пакінуў будынак Новага замка, адноўлены пасля вайны. Памяшканні перайшлі да абласной бібліятэкі і музея. Нават было рашэнне адкрыць у музеі Аддзел рэдкай і стäрадрукаванай кнігі. Невялікая група супрацоўнікаў пад кіраўніцтвам Ванды Іванаўны Шоцік беражліва перавезла кнігі са Старога замка ў выдзеленае для іх спецыяльнае сховішча і чытальную залу са зручнымі шафамі Ядкоўскага. Адразу ж пасля інвентарызацыі тут з'явіліся шматлікія вучоныя, аспіранты, студэнты. Нягледзячы на вялікія страты ў мінулым, тут сабраны сапраўдны скарб: больш за 20 тысяч старажытных кніг і рукапісаў амаль з усіх вышэйназваных бібліятэк Гродзеншчыны. 17 працэнтаў з іх - кнігі на лацінскай мове, яшчэ больш - звязаных з антычнасцю. Зараз аддзел папаўняецца беларускімі выданнямі, музей купляе рэдкія кнігі.



Антычны фонд аддзела - гэта у асноўным выданні XVI-XVIII стагоддзяў. На сваім месцы, у будынку каралеўскага замка ляжаць сёння пратаколы тых соймаў Рэчы Паспалітай, якія менавіта тут некалі і засядалі. Яны напісаны на латыні, міжнароднай мове старой Еўропы. Тут жа захоўваюцца кодэксы законаў Польшчы, Літвы, Прусіі, дакументы, пісьмы, прамовы каралёў і ў гонар каралёў, статуты кляштароў, унікальныя, часам, матэрыялы па гісторыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, найкаштоўнейшыя для гісторыкаў дакументы. Трэба толькі ведаць латынь. Тут жа ёсць шмат кніг, напісаных на латыні, па старажытнай гісторыі і па багаслоўю і літургіі, па філасофіі і этыцы, геаграфіі і друкарскай справе, граматыцы, філалогіі і, безумоўна, гэта творы вядомых аўтараў, напісаныя на мове арыгінала або ў перакладах. Вось толькі некаторыя з аўтараў: Аўгусцін, Варон, Вяргілій, Герадыан, Гарацый, Курцый Руф, Салюсцый, Светоній, Цэзар, Цыцэрон (фундаментальнае выданне з каштоўнымі каментарыямі), зборнікі паэтаў, пераказ Платона і інш. Антычнасць заўсёды лічылася крыніцай для пераймання, эталонам мудрасці. Адгэтуль - шматлікія зборнікі, дайшоўшыя да нашага часу.

Якая ж геаграфія выданняў? На тытульных старонках знаходзім: Вільня, Кракаў, Варшава, Антверпен, Базель, Венецыя, Вюрценберг, Кёльн, Лейдэн, Ліён, Нюрнберг, Падуя, Парыж, Франкфурт-на-Одэры і іншыя, тут і беларускія - Віцебск, Магілёў, Гродна, Нясвіж, а часцей за ўсіх - Полацк.

Антычная культура прадстаўлена, хоць і не так багата, і ў іншых музеях і бібліятэках Гродна. Гэтыя выданні, несумненна, саслужаць добрую службу даследчыкам. Антычнасць - гістарычная аснова культуры Еўропы, таму наша цікавасць да яе не знікае. Вось і ў нашым універсітэце з'явілася аддзяленне філолагаў-класікаў. Ці будуць у нас новыя латышовы і макавельскія? Час пакажа...

*Б. Віц-Маргулес,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*



## *Выбрыкі пяра.*

**Сёння мы адкрываем новую рубрыку ў нашай газеце і прапануем вытрымкі з крымінальных спраў, занатаваныя ў адной з пракуратур Гродзенскай вобласці студэнтам-практыкантам Сяргеем Псеўданімбавым у час летняй практыкі.**

# У КАНТОРУ ПІШУЦЬ, КАНТОРА ПІША...

Прошу Вас разобраться и помочь моей матери-старушке; инвалиду с детства I группы, в незаконных действиях (скрытии) преступлений Волковысской прокуратурой и милицией.

(Из заявления)

К. работает на Волковысском консервном заводе с 2.03.94 г. контролером с испытательным сроком два месяца.

(Из производственной характеристики)

Контроль за исполнением данного приказа был возложен, помимо других должностных лиц завода, и на гл. инженера Г., которому было поручено приготовить из выделенного мяса для приглашенных и гостей бутерброды.

( Из постановления о прекращении уголовного дела)

Таким образом оперуполномоченным ОУР с целью сокрытия совершенного преступления и с целью объективного рассмотрения заявления в отношении неправомерного действия работников ГРОВД допущена грубая фальсификация материалов проверки и нарушение законности.

(Из постановления о возбуждении дисциплинарного производства).

Он был одет в длинную зеленую куртку под усиками без головного убора.

( Из объяснения)

Считаю, что телесные повреждения у С. появились с целью уйти от ответственности за хищение мясопродуктов и избежать в этой связи увольнения из мясокомбината.

(Из кассационной жалобы)

# СПАРТАКІЯДА СТАРТАВАЛА



У лясным масіве "Пышкі" не так даўно прайшоў асенні лёгкаатлетычны крос у праграме універсітэцкай спартакіяды 1995-96 навучальнага года. Маляўніча і ўрачыста адбыўся парад адкрыцця спаборніцтваў. Удзельнікаў вітаў загадчык кафедры фізічнага выхавання, дацэнт В.А.Максімовіч. Добрае надвор'е спрыяла бадзёраму настрою і добрым вынікам на фінішы. А прынялі ўдзел у фінальнай частцы спаборніцтваў каля





400 студэнтаў з усіх факультэтаў універсітэта.

Дзяўчаты павінны былі пераадолець дыстанцыю ў 500 метраў, юнакі - 1000. Лепшы вынік сярод дзяўчат паказала студэнтка матэматычнага факультэта Наталля Жыгала, якая намнога апярэдзіла сваіх саперніц. Другі год запар стала яна чэмпіёнкай на гэтай дыстанцыі.

Сярод юнакоў па вельмі цяжкай кіламетровай дыстанцыі лепшы вынік 2 мін. 56 сек. паказаў студэнт 2-га курса фізіка-тэхнічнага факультэта Аркадзь Маскальцоў.



Вельмі напружаная барацьба праходзіла ў камандным першынстве. Усяго 3 ачкі аддзяляе каманду-пераможцу ад яе саперніцы, якая выйшла на другое месца. Камандную перамогу атрымалі будучыя матэматыкі, на другім месцы - будучыя юрысты, на трэцім - каманда фізіка-тэхнічнага факультэта.

Усе пераможцы і прызёры ўзнагароджаны граматамі і падарункамі. Лёгкаатлетычны крос - першы ў шэрагу спаборніцтваў сёлетняй спартакіяды універсітэта. Наступныя гульні - па міні-футболу. Аб выніках нашы чытачы даведаюцца пазней.

*А. Смалякоў,*
*старшы выкладчык*
*кафедры фізічнага выхавання.*



**Фота**
**Ул. Сарокіна.**

**Рэдактар С.МУРЫНА.**
**Камп'ютарная вёрстка**
**А.СЯМЁНАЎ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём - 1 друк. арк.
Здадзена ў набор 6.11.95г.
Заказ 4577
Наклад 700 асобнікаў.

Газета набрана і звярстана на камп'ютарнай тэхніцы выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні, вул. Паліграфістаў,4.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.